**УДК 94 (476) + 94 (438) + 283/289 (476)**

# ГРАМАДСКА-КУЛЬТУРНАЯ І РЭЛІГІЙНА-АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ РУСКІХ СТАРААБРАДНІКАЎ У ПОЛЬШЧЫ Ў 1920 – 1930-я ГАДЫ

***канд. гіст. навук, дац. А.М. ВАБІШЧЭВІЧ***
***(Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна)***

*У артыкуле прааналізавана культурна-асветніцкае жыццё рускіх стараабраднікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі, іх становішча ў Польскай дзяржаве ў перыяд паміж першай і другой сусветнымі войнамі. У цэлым становішча стараабраднікаў у міжваеннай Польшчы нельга ацаніць адназначна. Як і іншыя прадстаўнікі рускай меншасці, яны паспыталі на сабе вынікі нацыянальнай палітыкі польскіх урадаў. Аднак стараабраднікі атрымалі юрыдычныя падставы для свайго этнакультурнага і канфесійнага жыцця. У параўнанні з праваслаўнай царквой, стараабраднікі-беспапоўцы ўзамен на ідэйна-палітычную лаяльнасць атрымоўвалі падтрымку з боку Польскай дзяржавы. У такіх умовах ажыццяўляліся меры па захаванню традыцыйнай культуры, мовы, абрадаў стараабрадніцкага насельніцтва. Прыведзены звесткі аб стараабрадніцкіх абшчынах, бібліятэках-чытальнях Браслаўскага, Ашмянскага, Дзісенскага, Пастаўскага і іншых паветаў. Упершыню ўведзены ў навуковы ўжытак гістарычныя крыніцы з архіваў Літвы, Польшчы.*

**Уводзіны.** Пры распрацоўцы праблематыкі Заходняй Беларусі 1920 – 1930-х гадоў айчынныя даследчыкі на працягу многіх дзесяцігоддзяў фактычна ігнаравалі поліэтнічны характар гэтага краю. Хоць беларусы складалі большасць яго аўтахтоннага насельніцтва, але побач з імі спрадвеку ў гэтым рэгіёне жылі і іншыя этнічныя супольнасці, у тым ліку рускія. Толькі на сучасным этапе развіцця беларускай гістарычнай навукі вучоныя пачалі сур'ёзна вывучаць грамадска-палітычнае, культурнае і рэлігійнае жыццё рускіх у Польшчы ў цэлым і ў Заходняй Беларусі ў прыватнасці. Першай грунтоўнай працай, прысвечанай нацыянальна-культурнаму жыццю рускай меншасці, з'яўляецца дысертацыйнае даследаванне В.Р. Швайко, у якім паказана значэнне пытанняў культуры і асветы ў практычнай дзейнасці рускіх арганізацый у Польшчы міжваеннага часу, прааналізаваны асноўныя формы захавання там рускай культуры [1]. Аднак пытанні этнакультурнага жыцця рускіх стараабраднікаў у адзначанай працы не закраналіся. У манаграфіях А.А. Гарбацкага па гісторыі стараабрадніцтва на тэрыторыі Беларусі (XVII – пачатак XX стагоддзя) згаданы храналагічны перыяд не разгледжаны, прысутнічаюць толькі асобныя матэрыялы, атрыманыя ў ходзе палявых этнаграфічных экспедыцый [2; 3]. Варта адзначыць артыкул Т.В. Дабжынскай, дзе прааналізаваны галоўныя напрамкі дзейнасці Вышэйшага стараабрадніцкага савета ў Польшчы ў даволі кароткі прамежак часу (1927 – 1929 гг.) [4]. У польскай гістарыяграфіі таксама няма асобных даследаванняў па гісторыі і культуры рускіх стараабраднікаў. Е. Тамашэўскі фрагментарна паказаў этнакультурнае жыццё рускіх (у тым ліку стараабраднікаў) [5].

**Асноўная частка.** Улічваючы слабую навуковую распрацаванасць адзначанай тэматыкі, аўтар дадзенага даследавання вырашыў прааналізаваць становішча, культурнае і канфесійнае жыццё рускіх стараабраднікаў ў заходнебеларускім рэгіёне. Для выканання гэтай мэты былі вызначаны наступныя задачы: высветліць прававы статус, тэрыторыю рассялення стараабраднікаў; прасачыць эвалюцыю ўзаемаадносін стараабраднікаў з іншымі групамі рускага насельніцтва, польскімі ўладамі; паказаць дзейнасць стараабрадніцкіх абшчын у справе захавання рускай культуры, мовы, традыцый і звычаяў. Хоць тэрміны «стараабраднікі» і «стараверы» з'яўляюцца сінонімамі, аднак аўтар артыкула падтрымаў пазіцыю А.А. Гарбацкага і перавагу аддаў першаму як больш адпаведнаму па сэнсу [3, с. 11]. У якасці крыніцазнаўчай базы работы выступілі шматлікія крыніцы, з якіх асаблівую каштоўнасць маюць дакументальныя матэрыялы з фондаў архіўных устаноў Беларусі, Літвы і Польшчы.

Пасля Рыжскага міру 1921 года ў межах Польскай дзяржавы разам з украінцамі, беларусамі апынуліся і рускія. Паводле перапісу насельніцтва 1931 года, у Польшчы налічвалася 138,7 тыс. рускіх. Большай была руская прысутнасць у заходнебеларускіх і заходнеўкраінскіх землях. Вялікія групы рускага насельніцтва знаходзіліся ў Віленскім (3,5 %), Беластоцкім (2 %), Палескім (1,4 %), Навагрудскім (0,6 %), Валынскім (1,1 %) ваяводствах, у астатніх ваяводствах доля рускіх не пераўзыходзіла 0,2 % агульнай колькасці жыхароў [6, с. 78]. На тэрыторыі міжваеннай Польшчы выразна вылучаліся 3 групы рускага насельніцтва: 1) рускія і іх нашчадкі, якія апынуліся там у XIX – пачатку XX стагоддзя (чыноўнікі, мяшчане, інтэлігенцыя); 2) эмігранты; 3) рускія стараабраднікі. Стараабраднікі пераважалі сярод рускага вясковага насельніцтва ў Віленскім і Беластоцкім ваяводствах. Асабліва вылучалася Браслаўшчына, якая мела стараабрадніцкія традыцыі з XVII – XVIII стагоддзяў. Стараабраднікі працягвалі свае працоўныя традыцыі – займаліся земляробствам (вырошчвалі лён, авёс, ячмень), жывёлагадоўляй. Найбольш распаўсюджанымі былі будаўнічыя промыслы, нарыхтоўка і апрацоўка драўніны. Пашыранай з'явай было адыходніцтва на сезонныя працы ў гарады, суседнюю Латвію [3, с. 170 – 171]. У асяроддзі стараабраднікаў захоўваўся традыцыйны ўклад жыцця, царкоўная абраднасць, руская мова.

Становішча рускай меншасці ў міжваеннай Польшчы было супярэчлівым. З аднаго боку, рускія атрымалі нароўні з іншымі этнічнымі супольнасцямі канстытуцыйныя гарантыі ў галіне адукацыі, культуры, канфесійнага жыцця, з другога – мясцовыя ўлады ўсяляк перашкаджалі рэалізацыі гэтых правоў і свабод. Антырускія настроі сярод мясцовай адміністрацыі праяўляліся пераважна ў адзначаных усходніх ваяводствах Польшчы. Рускія не маглі стварыць школы на роднай мове, якія фінансаваліся Польскай дзяржавай. З-за сваёй малалікасці, распыленага характару рассялення па ўсёй Польшчы яны ў асноўным не дасягалі 25 % прысутнасці сярод жыхароў пэўнай мясцовасці, як патрабавалася паводле Закона аб мове і арганізацыі школьнай справы для нацыянальных меншасцей ад 31 ліпеня 1924 года. Руская мова не была ўключана ў пералік моў нацыянальных меншасцей.

Узаемаадносіны стараабраднікаў з іншымі групамі рускага насельніцтва былі неадназначнымі. Яскрава выдзяляліся 2 асноўныя перыяды. У час першага (1920-я гг.) стараабраднікі не дапускалі іх атаясамлівання з іншымі групамі. Калі паміж першымі 2-мя вышэйадзначанымі групамі тады назіраліся працэсы ўзаемадзеяння і збліжэння, то стараабраднікі трымаліся адасоблена. Другі этап (1930-я гг.) характарызаваўся супрацоўніцтвам усіх груп дзеля абароны сваіх канфесійных і асветніцкіх інтарэсаў. Аналіз узаемаадносін рускіх стараабраднікаў з уладнымі структурамі паказвае, што ў адносінах да Польскай дзяржавы стараабраднікі з самага пачатку праяўлялі палітычную лаяльнасць. На наш погляд, гэтая акалічнасць паспрыяла набыццю імі правоў польскіх грамадзян. Якраз сваім прававым статусам стараабраднікі адрозніваліся ад іншых груп рускага насельніцтва. Рускія стараабраднікі, якія прызнаваліся аўтахтонным насельніцтвам краю, адрозніваліся ў сацыяльна-псіхалагічным плане ад рускіх эмігранцкіх колаў. Гэта таксама тлумачыць меншую палітызаванасць жыцця рускіх стараабраднікаў.

Першая палова 1920-х гадоў характарызавалася адаптацыяй рускіх стараабраднікаў да новых геапалітычных умоў. Частка стараабраднікаў, якая ў час першай сусветнай вайны апынулася ў бежанстве ў Расіі, у пачатку 1920-х гадоў, вярнулася назад. Адбывалася паступовая стабілізацыя этнаканфесійнага жыцця рускіх стараабраднікаў, аднаўленне іх храмаў. Так, у чэрвені 1921 года была ўрачыста асвечана стараабрадніцкая царква ў Мікалаюнцах Браслаўскага павета [3, с. 192].

Выключную ролю ў наладжванні паўнацэннага рэлігійнага і культурнага жыцця стараабрадніцкай меншасці іграла яе нешматлікая інтэлігенцыя, асабліва ў Вільні. Як прызнавалі польскія кампетэнтныя органы, вядомымі грамадскімі і палітычнымі лідэрамі стараабраднікаў з'яўляліся прадстаўнікі ўплывовай і заможнай сям'і Піманавых [7, с. 135]. Аўтарытэтны галава сям'і Арсеній Маісеевіч Піманаў з'яўляўся кіраўніком Віленскай стараабрадніцкай абшчыны [8, л. 41, 53]. Да першай сусветнай вайны А.М. Піманаў праявіў сябе як таленавіты рамеснік, прадпрымальнік. Менавіта яму царскія ўлады даверылі будаваць у Вільні помнікі М. Мураўёву і Кацярыне ІІ. На пабудову помніка імператрыцы Кацярыны ІІ ён асабіста ахвяраваў 10 тыс. рублёў [9, л. 332.]. Вялікую зацікаўленасць да грамадскіх праблем праяўлялі сыны А.М. Піманава – Барыс і Георгій. Разам з іншымі дзеячамі Піманавы выступілі ініцыятарамі правядзення прадстаўнічага з'езда стараабраднікаў-беспапоўцаў (мясцовае насельніцтва належала пераважна да тых галін, якія не прызнавалі духоўную іерархію (беспапоўцаў) – федасееўцаў, філіпаўцаў).

І Усяпольскі з'езд стараабраднікаў-беспапоўцаў (Вільня, 15 – 17 кастрычніка 1925 года) прадэманстраваў абсалютную палітычную лаяльнасць да Польскай дзяржавы. Былі накіраваны тэлеграмы-падзякі прэзідэнту, прэм'ер-міністру, міністру ўнутраных спраў, міністру веравызнанняў і грамадскай асветы, мясцовай адміністрацыі. Пасяджэнні з'езда праходзілі ў Свята-Пакроўскім стараабрадніцкім храме, што размяшчаўся ў Новым свеце, прадмесці Вільні. Усяго прысутнічала 87 дэлегатаў. Сярод асоб, якія выступалі з прывітальнымі прамовамі, былі сенатар В. Багдановіч, пасол М. Сярэбранікаў. Апошні так ахарактарызаваў перспектывы ўзаемаадносін стараабраднікаў і польскіх улад: «Уваходзячы зараз у склад Польскай дзяржавы, стараабраднікі сумленна, лаяльна і пакорна выканаюць грамадзянскія абавязкі і ў адносінах да гэтай дзяржавы, Канстытуцыя якой гарантуе ахову нацыянальных і рэлігійных пачуццяў…» [8, л. 14].

У склад выбранага на гэтым з'ездзе Вышэйшага стараабрадніцкага савета (ВСС) увайшлі 14 чалавек: Піманаў Барыс Арсеньевіч, Піманаў Георгій Арсеньевіч, Андрэеў Восіп Мацвеевіч, Голубеў Пётр Іванавіч, духоўны настаўнік Егупёнак Сімяон Фёдаравіч, Самазванаў Дзмітрый Кіпрыянавіч, Арцем'еў Фёдар Кіпрыянавіч, Мацвееў Анісім Яфімавіч, Нікіцін Рыгор Сафонавіч, духоўныя настаўнікі Якаўлеў Цімафей Кузьміч, Кузняцоў Фёдар Сіланцьевіч, Егупёнак Максім Сямёнавіч, Елісееў Яфім Еўстаф'евіч, Бартошкін Анісіфар Пятровіч. Старшынёй ВСС у Польшчы стаў А.М. Піманаў. Паводле зацверджанага на згаданым з'ездзе праекта статута, стараабрадніцкай абшчынай прызнавалася «згуртаванне асоб стараабрадніцкага веравызнання, мэтай якога з'яўляецца задавальненне рэлігійных, маральных, асветніцкіх і дабрачынных патрэб членаў дадзенага царкоўнага прыходу» [8, л. 61].

Асноўныя задачы ВСС у галіне культуры і асветы сфармуляваў у сваім дакладзе на з'ездзе Б. Піманаў. Неабходна было дамагацца ад польскага ўраду выдання асобнага дадатку да закона аб усеагульнай адукацыі. Выказвалася патрабаванне аб павелічэнні колькасці гадзін для ўрокаў Закона Божага. Менавіта стараабрадніцкія школы павінны даваць моладзі веды па рэлігіі, абрадах і гісторыі царквы, асновах стараабрадніцкага светапогляду. Важным лічылася вывучэнне разам з польскай і роднай для дзяцей ста-

раабраднікаў рускай мовы, выкладання на ёй («але з польскай тэрміналогіяй») усіх прадметаў, акрамя польскай мовы, гісторыі і краязнаўства. Пры вывучэнне рускай мовы прадугледжвалася прытрымліваца новай арфаграфіі. Да выкладання Закона Божага, царкоўна-славянскай мовы, чытання, царкоўных спеваў неабходна было прыцягваць духоўнага настаўніка пэўнай абшчыны ці свецкую асобу (са згоды ўправы абшчыны). На ВСС ускладваўся абавязак падбору абавязковых падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, зацверджаных адпаведнымі польскімі ўладамі, а таксама вырашэнне кадравага пытання пры ўзгадненні кандыдатур на настаўніцкія пасады са школьнымі інспектарамі. Патрабавалася таксама ўраўнаванне стараабрадніцкіх пачатковых школ з адпаведнымі польскімі не толькі ў правах, але і ў матэрыяльным забеспячэнні з боку дзяржаўных структур. У тых мясцовасцях, дзе была недастатковая колькасць дзяцей стараабрадніцкага веравызнання для адкрыцця самастойнай школы (менш 40), трэба было выкладанне рэлігіі, царкоўна-славянскай мовы, спеваў праводзіць у існуючых паблізу польскіх, беларускіх і іншых нацыянальных школах (таксама мясцовымі духоўнымі настаўнікамі ці заўгодненымі свецкімі кандыдатамі) [8, л. 34 – 36]. Пытанні пазашкольнай адукацыі, выхавання дзяцей і падлеткаў з сем'яў стараабраднікаў закранаў у сваім выступленні на з'ездзе П. Голубеў. Выкладзеныя ў дакладах прапановы былі ўключаны ў падрыхтаваны ВСС мемарандум, які быў пададзены польскаму ўраду.

Пасля праведзенага з'езда значна паскорыўся працэс урэгулявання прававога становішча стараабрадніцкіх абшчын. Трэба меркаваць, што польскі ўрад не хацеў дапусціць таго, каб стараабраднікі апынуліся пад уплыўвам праваслаўнай царквы. На фоне нявызначанага статусу праваслаўнай царквы і дыскрымінацыйных мер у адносінах да яе падтрымка стараабрадніцкай царквы азначала, што польскія ўлады меркавалі ў перспектыве пераўтварыць яе ў канкурэнта праваслаўнай царквы, супрацьвагу ёй [10, с. 195; 11, с. 223]. Вышэйшы стараабрадніцкі савет ажыццяўляў актыўныя захады па рэалізацыі прынятых на з'ездзе рашэнняў. Для забеспячэння стараабрадніцкіх школ падрыхтаванымі кадрамі яго лідэры дамагаліся адкрыцця курсаў. Аб выдзяленні грашовых сродкаў на такія курсы ў кастрычніку 1927 года падавалася хадайніцтва да віленскага ваяводы. Неўзабаве ў Вільні былі арганізаваны адпаведныя курсы [12]. Асобным распараджэннем прэзідэнта Польшчы ад 22 сакавіка 1928 года быў урэгуляваны статус стараабрадніцкай царквы. Навучанне дзяцей стараабраднікаў рэлігіі павінны арганізаваць самі прадстаўнікі гэтай этнаканфесійнай меншасці праз духоўных асоб. Статут Усходняй стараабрадніцкай царквы без духоўнай іерархіі (такой была афіцыйная назва царквы) быў зацверджаны распараджэннем польскага ўрада 29 жніўня 1928 года. Паводле статута, абшчыны стараабраднікаў мелі права праводзіць рэлігійную, культурна-асветніцкую, дабрачынную дзейнасць [13].

Зацверджаныя дакументы паспрыялі адкрыццю дзяржаўных пачатковых школ для дзяцей стараабраднікаў. Прынятая рашэннем Духоўнага суда праграма выкладання Закона Божага ў дзяржаўных школах для дзяцей стараабраднікаў была зацверджана ВСС на яго пленарным пасяджэнні 16 кастрычніка 1928 года [14, л. 1 – 8]. З рускіх навучальных устаноў толькі пачатковыя школы для стараабраднікаў у Вільні атрымалі дзяржаўнае фінансаванне. Вучэбная праграма Віленскай 7-класнай пачатковай стараабрадніцкай школы, якая ўтрымлівалася за дзяржаўны кошт і размяшчалася ў асобным памяшканні, выдзеленым Віленскай абшчынай, была базавай для іншых школ, дзе займаліся дзеці стараабраднікаў. Аднак навучанне натыкалася на цэлы шэраг цяжкасцей. Акрамя кадравага пытання, вострай праблемай з'яўлялася адсутнасць і недахоп навучальных дапаможнікаў. Па выніках праверкі прыходскіх школ Віленскага ваяводства, дзе для дзяцей стараабраднікаў выкладалася рэлігія, В.М. Андрэеў дакладваў 28 ліпеня 1929 года ў ВСС: «Многія з законавучыцеляў, ідучы на ўрок у школу, з'яўляюцца туды без абраза, які трэба мець пры сабе для правядзення малітвы перад пачаткам урока Закона Божага…» [15]. Да пачатку 1930-х гадоў у Вільні засталася толькі 7-класная пачатковая стараабрадніцкая школа і гімназія імя А.С. Пушкіна, створаная ў выніку аб'яднання гімназіі Л. Паспелавай і гімназіі Віленскага рускага таварыства, якую апекавала ўдава малодшага сына А.С. Пушкіна, Рыгора, – Варвара Аляксееўна Пушкіна.

Этнаканфесійнае і культурнае жыццё стараабрадніцкай меншасці ўскладнялася ідэйна-палітычнымі супярэчнасцямі паміж прадстаўнікамі розных рускіх аб'яднанняў. Польская паліцыя ў 1928 годзе ў сваіх справаздачах адзначала спрэчку паміж 3-ма групамі: эмігрантамі, аўтахтоннымі рускімі і кіраўніцтвам Расійскага народнага аб'яднання (РНА), кожная з якіх прэтэндавала на лідэрства ў справе абароны інтарэсаў рускіх у Польскай дзяржаве. У час парламенцкіх выбараў у Польшчы ў 1930 годзе ВСС пайшоў на супрацоўніцтва з пілсудчыкамі. «Нельга не ацаніць дастойна гэты заклік Беспартыйнага блока, які прапанаваў нам, рускім стараабраднікам, магчымасць прыняцця рэальнага ўдзелу ў дзяржаўным жыцці Польскай дзяржавы… і такім чынам **садзейнічаць збліжэнню рускай меншасці з палякамі**» (са звароту Цэнтральнага выбарчага Стараабрадніцкага камітэта ў лістападзе 1930 года) [16]. Намеснік старшыні ВСС Б. Піманаў быў выбраны паслом (дэпутатам) польскага сейма.

У пачатку 1930-х гадоў якраз група рускіх дзеячаў на чале з Б. Піманавым, якая выступала за ўзаемадзеянне і супрацоўніцтва з польскім урадам, складала сур'ёзнае палітычнае саперніцтва лідэрам РНА (М. Сярэбранікаву і інш.). Ва ўмовах, калі М. Сярэбранікаў публічна выступаў з рэзкай крытыкай палітыкі польскіх улад адносна рускага насельніцтва, падтрымку атрымаў менавіта Б. Піманаў. Яго вы-

лучэнне на становішча лідэра рускай меншасці адбывалася па ініцыятыве МУС Польшчы. На I з'ездзе Саюза арганізацый рускай меншасці ў Польшчы, які адбыўся 28 – 29 чэрвеня 1931 года ў Варшаве, было заяўлена аб адмове ад вялікадзяржаўных ідэй, якіх раней прытрымліваўся РНА [17]. На новую арганізацыю, старшынёй якой стаў Б. Піманаў, ускладвалася задача каардынацыі дзейнасці ўсіх згуртаванняў рускай меншасці ў Польшчы. Сярод шэрагу прынятых рэзалюцый адна датычыла культурна-асветніцкіх патрэб рускай меншасці (падрыхтоўкі ў дзяржаўных навучальных установах кадраў для сярэдніх і пачатковых рускіх школ; вывучэння ў польскіх школах па жаданню бацькоў вучняў рускай, царкоўна-славянскай моў, Закона Божага на рускай мове і інш.). Сам Б. Піманаў хуткае зацвярджэнне статута арганізацыі лічыў знамянальнай падзеяй, бо раней руская меншасць у Польшчы афіцыйна не прызнавалася. Умовы існавання стараабраднікаў у гэтай краіне на VII кангрэсе нацыянальных меншасцей у Жэневе (1931 г.) ён назваў добрымі [18, с. 476, 478]. Быў узяты курс на супрацоўніцтва з дзяржаўнымі структурамі, інтэграцыю ў польскае грамадскае жыццё. Хоць Саюз арганізацый рускай меншасці прымаў удзел у выбарах сумесна з Беспартыйным блокам супрацоўніцтва з урадам, аднак яго грамадска-палітычная актыўнасць была абмежаванай. Таму галоўнае месца займала праца па падтрымцы нешматлікіх рускіх навучальных устаноў, грамадска-культурнай і рэлігійна-асветніцкай дзейнасці. Як і РНА, Саюз арганізацый рускай меншасці настойліва дабіваўся надання рускай мове статуса мовы нацыянальнай меншасці [19, с. 48].

Вынікі арганізацыйнай працы падвёў II Усяпольскі стараабрадніцкі з'езд (сабор) (Вільня, 15 – 16 кастрычніка 1930 года), у якім прымалі ўдзел 92 дэлегаты, з іх 30 духоўных настаўнікаў [20, л. 180]. Друкаваным органам ВСС быў зацверджаны часопіс «Вестник Высшего Старообрядческого Совета в Польше», рэдакцыйную раду якога ўзначаліў А.М. Піманаў. На працягу 1932 – 1933 гадоў часопіс выдаваўся ў Беларускай друкарні імя Ф. Скарыны, за што ВСС заплаціў ёй 1915 злотых [20]. На падставе архіўных крыніц удалося падлічыць колькасць абшчын стараабраднікаў і вернікаў па стану на кастрычнік 1930 года. У Віленскім ваяводстве налічвалася 40 абшчын, у якіх было аб'яднана 38024 чалавекі (ці 37924 чалавекі, бо звесткі па Відзаўскай абшчыне Браслаўскага павета адрозніваюцца – у некаторых крыніцах замест 1960 падаецца 1860 вернікаў) [21, л. 96 – 97; 22, л. 5 – 5 адв., 91]. Менавіта Браслаўскі павет быў найбольш прадстаўлены прысутнасцю стараабраднікаў – 18 абшчын (ранейшая ў Турмонтах пазначана ўжо як неіснуючая), якія аб'ядноўвалі 17461 (17361) верніка. Акрамя згаданай ужо абшчыны ў Відзах, самымі шматлікімі ў Браслаўскім павеце былі таксама Кублішчынская (2260), Барсучынская (1972), Ніўнікская (1539), Буеўская (1446) абшчыны. У Свянцянскім павеце ў 10 абшчынах налічвалася 10563 стараабраднікі. У Віленска-Трокскім павеце з 5239 вернікаў 4000 прыходзілася на самую шматлюдную абшчыну ў Вільні, у 3 астатніх было ад 316 да 468 чалавек. Масалішская абшчына на тэрыторыі гэтага павета пазначана як неіснуючая. У Дзісенскім павеце 4 абшчыны аб'ядноўвалі 2751 стараабрадніка, з іх буйнейшай была Германавіцкая (930 вернікаў). У Ашмянскім павеце Нова-Слабодская абшчына таксама фігуравала ў якасці неіснуючай, а ўсяго ў павеце было толькі 2 абшчыны (1040 вернікаў). Прыкладна такая ж сітуацыя была ў Пастаўскім павеце – 2 абшчыны (970 вернікаў). У саміх Паставах стараабрадніцкая абшчына лічылася неіснуючай. У Беластоцкім ваяводстве існавала ў той час 8 абшчын (5741 вернік), якія размяшчаліся пераважна ў Сувалкаўскім і часткова Аўгустоўскім паветах.

Пытанні адукацыі займалі прыярытэтнае значэнне разам з клопатам пра культавыя святыні. Абцяжарвалі працу ў гэтым напрамку як суб'ектыўныя, так і аб'ектыўныя цяжкасці. Пытанне аб выкладанні Закона Божага фактычна прымалася польскімі ўладамі па кожнай школе асобна. Можна сцвярджаць аб валюнтарысцкіх адносінах да адукацыйных інтарэсаў стараабрадніцкага насельніцтва. У Залескай школе Дзісенскага павета было дазволена па-за раскладам выдзяляць для дзяцей стараабраднікаў 2 гадзіны рэлігіі [23]. Як паведамляў у канцы 1930 года ў ВСС Арцемій Ільіноў, школьныя ўлады не дапускалі выкладанне «рускай граматы» ў Ластовіцкай абшчыне таго ж павета, хаця ў вёсках Ластовічы, Запалоўе, Новае Каралёва, Перадалы было 58 вучняў. «Просім хаця б выкладаць Закон Божы (царкоўна-славянскую мову) па 2 гадзіны штодзень» [24]. Неўзабаве ўсё-такі дазвол быў атрыманы. У лістападзе 1933 года Віленскі куратарыум паведамляў ВСС аб тым, што немагчыма адкрыць грамадскую пачатковую школу для дзяцей стараабраднікаў у Ніўніках і Мацеўках Браслаўскага павета, бо да гэтых школ належаць дзеці іншых веравызнанняў і яны не могуць быць далучаны да іншых школ, што знаходзяцца на адлегласці 3 – 4 км ад месца пражывання дзяцей [14, л. 13]. Вучоба дзяцей стараабраднікаў ўскладнялася і матэрыяльнай нястачай. У лютым 1934 года газеты паведамлялі, што сярод сялян Дзісенскага і іншых паветаў Віленскага ваяводства назіраўся голад. Вышэйшы стараабрадніцкі савет выдзяляў стыпендыі для навучання, аказваў матэрыяльную падтрымку незаможным вучням. Так, у 1935/1936 навучальным годзе 15 вучняў-стараабраднікаў былі залічаны ў якасці стыпендыятаў ў Віленскую рускую гімназію імя А.С. Пушкіна. Памер стыпендыі складаў 12,5 ці 25 злотых [25].

Акрамя школ, таксама ствараліся бібліятэкі-чытальні. Як сведчыць табліца 1, у пачатку 1937 года бібліятэкі-чытальні дзейнічалі ў 11 стараабрадніцкіх абшчынах: у Браслаўскім павеце – 5; Віленска-Трокскім – 2; Свянцянскім – 2; Сувалкаўскім – 1; Дзісенскім – 1. Фонды іх былі нешматлікімі – усяго 3417 кніг [22, л. 22]. Такая сітуацыя тлумачылася адсутнасцю моцнай уласнай паліграфічнай базы, неза-

можнасцю стараабрадніцкіх сем'яў. Адна з першых бібліятэк-чытальняў была адкрыта ў верасні 1931 года ў Варонкаўскай абшчыне Браслаўскага павета (727 кніг) [9, л. 329]. У 1933 годзе стараабраднікі Кірылінскай абшчыны арганізавалі бібліятэку-чытальню [26]. Трэба адзначыць, што больш паловы бібліятэк-чытальняў узнікла ў 1935 – 1936 гадах.

Табліца 1

Стараабрадніцкія бібліятэкі-чытальні (люты 1937 года)

| Абшчына | Час заснавання | Месцазнаходжанне | Бібліятэкар | Колькасць кніг |
|---|---|---|---|---|
| Варонкаўская | 25.09.1931 | Варонка (Браслаўскі павет) | Е. Сямёнаў | 727 |
| Ніўнікская | 26.12.1935 | Ніўнікі (Браслаўскі павет) | М. Гушчанка | 342 |
| Міхалоўская | 5.02.1935 | Міхалова (Свянцянскі павет) | духоўны настаўнік Я. Іваноў | 303 |
| Аляксандраўская | 28.11.1934 | Аляксандраўск (Сувалкаўскі павет) | П. Пятроў | 145 |
| Мікалаюнская | 15.07.1932 | Мікалаюнцы (Браслаўскі павет) | І. Ягораў | 162 |
| Віленская | 1932 г. | г. Вільня | – | 226 |
| Дукштанская | 25.07.1933 | Дукшты (Свянцянскі павет) | – | 245 |
| Відзаўская | 8.05.1935 | Відзы (Браслаўскі павет) | – | 375 |
| Ракаўская | 4.01.1935 | Ракаўцы (Дзісенскі павет) | Д. Самазванаў | 322 |
| Кірылінская | 27.12.1935 | Кірыліна (Браслаўскі павет) | А. Масцюлін | 285 |
| Мітрафанаўская | 24.12.1936 | Мітрафанаўка (Віленска-Трокскі павет) | К. Сасноўскі | 285 |

Сярод мясцовага стараабрадніцкага насельніцтва папулярнасцю карысталіся рэлігійна-асветніцкія гурткі моладзі. Як сведчыць статут, асноўнымі задачамі гуртка ў мястэчку Дукшты Свянцянскага павета былі наступныя: вывучэнне свяшчэнных кніг, хрысціянскіх дагматаў, царкоўных спеваў, рускай мовы, літаратуры, гісторыі Расіі і стараабрадніцтва; правядзенне лекцый; стварэнне бібліятэк-чытальняў Падобныя задачы былі замацаваны таксама ў статутах гурткоў у Відзах, Турмонтах [27, л. 1, 123, 135]. Рэлігійна-асветніцкія гурткі стараабрадніцкай моладзі дзейнічалі таксама ў Віленскай, Дукштанскай, Ніўнікскай абшчынах. Гурток у Відзах, створаны ў маі 1935 года, наладзіў працу бібліятэкі-чытальні, паслугамі якой бясплатна карысталіся ўсе жадаючыя, праводзіў гутаркі на рэлігійна-духоўныя тэмы. У ліпені 1935 года ён аб'ядноўваў 43 чалавекі. Драматычная секцыя гуртка ў жніўні 1935 года паказвала п'есу А. Астроўскага «Не ў свае сані не садзіся», на якую дзеці атрымоўвалі бясплатныя білеты. Гурток наладжваў навагоднія святкаванні. 13 красавіка 1936 года, на другі дзень Вялікадня, для дзяцей стараабрадніцкага веравызнання было наладжана свята «Чырвонае яйка». Аднак матэрыяльныя цяжкасці перашкаджалі плённай культурна-асветніцкай працы. Як адзначаў у адным з лістоў ў ВСС старшыня ўправы гуртка А. Арцем'еў, «матэрыяльная нястача перашкаджае поўнаму развіццю гуртка. …Драматычная секцыя рыхтуе п'есу Астроўскага «Свае людзі – паладзім», але да спектакля яшчэ далёка, няма грошай» [27, л. 68 адв., 80].

Актуальныя праблемы культурна-асветніцкага жыцця абмяркоўваліся на ІІІ Усяпольскім стараабрадніцкім з'ездзе (саборы) (Вільня, 17 – 18 лютага 1936 года), удзельнікамі якога былі 119 дэлегатаў і духоўных настаўнікаў. У спісе фігуравала 49 стараабрадніцкіх абшчын [28]. Як сведчаць архіўныя, статыстычныя і іншыя крыніцы, у асяроддзі стараабраднікаў да канца 1930-х гадоў назіралася ўстойлівая тэндэнцыя захавання сваёй адметнасці ў складзе Польскай дзяржавы. Архіўныя крыніцы міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы сведчаць аб тым, што ў межах Польскай дзяржавы ў 1937 годзе існавала 48 абшчын стараабраднікаў, у якіх налічвалася 49700 вернікаў (без уліку Гедзейскай абшчыны Ашмянскага павета, па якой не прыведзены адпаведныя звесткі) [9, л. 318 – 322]. Калі ўлічыць дадзеныя, прыведзеныя ў сакрэтнай справаздачы віленскага ваяводы ў Міністэрства ўнутраных спраў Польшчы ў сярэдзіне 1937 года, то агульная колькасць стараабраднікаў складала 50257 чалавек. У некаторых крыніцах указваецца на 60 тыс. вернікаў [9, л. 308 – 310, 326]. У табліцы 2 прыведзены звесткі аб асноўных абшчынах стараабраднікаў, што размяшчаліся на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь [9, л. 318 – 319, 321 – 322]. Колькасныя паказчыкі пацвярджаюць тое, што найбольш населеным стараабраднікамі быў Браслаўскі павет (19118 вернікаў, ці 38 % ад агульнай колькасці). У ходзе праведзенага аналізу высветлена, што прырост ў параўнанні з 1930 годам складаў у цэлым у межах Польскай дзяржавы 14,8 %. Звесткі па асобных ваяводствах выглядаюць наступным чынам: у Віленскім ваяводстве прырост вернікаў складаў 12,5 % (агульная колькасць вернікаў дасягнула 42777 чалавек); у Беластоцкім – 30 % (7480 чалавек). Станоўчая дынаміка назіралася па ўсіх паветах Віленскага ваяводства: у Браслаўскім павеце – 9,4 %; Свянцянскім – 15,4 %; Віленска-Трокскім – 14,4 %; Ашмянскім – не менш 11 % (па Гедзейскай гміне ўзяты звесткі за 1930 год); Дзісенскім – 8,8 %; Пастаўскім – 14 %.

Матэрыялы Браслаўскага павятовага староства сведчаць пра тое, што ў Відзаўскай гміне на мяжы 1937 і 1938 гадоў рускія складалі 15,1 % усяго насельніцтва (другая пасля палякаў этнічная група). Сярод

мясцовых рускіх абсалютнай большасцю былі стараабраднікі – 2109 чалавек (14,1 % усіх жыхароў Відзаўскай гміны) [30]. Паводле польскага дэмографа П. Эберхардта, у Браслаўскім і Дзісенскім паветах жыло каля 25 тыс. стараабраднікаў [31, с. 116].

Табліца 2

Абшчыны стараабраднікаў у Браслаўскім, Ашмянскім, Дзісенскім, Пастаўскім паветах (1937 г.)

| Назва абшчыны, год яе заснавання, тэрытарыяльная прыналежнасць, лічба вернікаў | Год будаўніцтва храма, матэрыял | Імя і прозвішча духаўніка абшчыны, год нараджэння і дата асвячэння | Склад прэзідыума абшчыны |
|---|---|---|---|
| Барсучынская, 1906 г.,<br>в. Барсучына і інш., 1158 вернікаў | 1894 г.<br>(1889 г. [29, с. 220]),<br>драўл. | Войтаў Фёдар<br>нар. 8.II.1878; 1.IV.1925 г. | Міхайлаў С.<br>Міхайлаў Э. |
| Буеўшчынская, 1875 г.,<br>Перабродская гміна, 1716 вернікаў | 1875 г.,<br>драўл. | Нікіцін Сысой<br>нар. 6.VIII.1880 г.; 6. VII.1931 г. | Пушкароў Ф.<br>Дзевятнікаў |
| Буловішская, 1880 г.,<br>Плюская гміна, 730 вернікаў | 1880 г.,<br>драўл. | Коласаў Пётр<br>нар. 29.VIII.1880 г.; 21.VII.1929 г. | Данілаў Н.<br>Рыбакоў М. |
| Відзаўская, 1680 г.,<br>Відзаўская гміна, 2012 вернікаў | 1910 г.,<br>мурав. | Бабіч Сава<br>нар. – ; 9.VII.1935 г. | Бірулін М. |
| Воронкаўская, 1914 г.,<br>Гміна Ёды, 814 вернікаў | 1914 г.,<br>драўл. | Марозаў Фёдар<br>нар. 8.II.1872 г.; 31.I.1917 г. | Сямёнаў<br>Цярэнцьеў |
| Грыгораўская, 1905 г.,<br>Богінская гміна, 792 вернікі | –<br>драўл. | Яфімаў Флор<br>нар. 18.VIII.1846 г.; 26.IX.1902 г. | Кузняцоў<br>Іваноў |
| Даведзінская, 1920 г.,<br>Відзаўская гміна, 465 вернікаў | 1909 г.,<br>драўл. | Арцем'еў Федасей<br>нар. 11.X.1864 г.; 10.I.1920 г. | Іваноў Г.<br>Прусакоў П. |
| Друйская, 1620 г.,<br>Друйская гміна, 952 вернікі | 1898 г.,<br>драўл. | Аляксееў Арсеній<br>нар. – ; 25.III.1934 г. | Аляксееў<br>Калітончык |
| Ерзоўская, 1926 г.,<br>Гміна Ёды, 671 вернік | 1912 г.,<br>драўл. | Кандрацьеў Іларыён<br>нар. 1.X.1869 г.; 28.V.1926 г. | Ротчанкаў<br>Марозаў С. |
| Кірылінская, 1706 г.,<br>Слабодская гміна, 970 вернікаў | 1912 г.,<br>драўл. | Масцюлін Андрэй<br>нар. – ; 12.V.1935 г. | Масцюлін А. |
| Кублішчынская, 1745 г.,<br>Гміна Новы Пагост, 2512 вернікаў | 1905 г.,<br>драўл. | – | Міхайлаў<br>Пушкоў Г. |
| Лаўнікская, 1705 г.,<br>Плюская гміна, 905 вернікаў | 1905 г.,<br>драўл. | Кавалёў Аляксей<br>нар. 1861 г.; 11.X.1923 г. | Абжыгайлаў Г.<br>Зелянкоў А. |
| Мікалаюнская, 1917 г.,<br>Дрысвяцкая гміна, 643 вернікі | 1920 г.,<br>драўл. | Ульянаў Сямён<br>нар. 3.II.1879 г.; 24.III.1922 г. | Ягораў І.<br>Ягораў Е. |
| Мінкавіцкая, 1878 г.,<br>Дрысвяцкая гміна, 637 вернікаў | 1924 г.,<br>драўл. | Рыжэшчанка Пётр<br>нар. 22.VI.1871 г.; 8.V.1930 г. | Багамольнікаў Е.<br>Кузняцоў Д. |
| Мацешская, 1884 г.,<br>Гміна Ёды, 1193 вернікі | 1884 г.,<br>драўл. | Зуеў Іван<br>нар. – ; 18.III.1934 г. | Зуеў І.<br>Іваноў Ф. |
| Ніўнікская, 1880 г.,<br>Гміна Перабродդзе, 1774 вернікі | 1912 г.,<br>драўл. | Смерцьеў Карп<br>нар. 1880 г.; 29.VIII.1912 г. | Смерцьеў К.<br>Іваноў П. |
| Астравіцкая, 1906 г.,<br>Відзаўская гміна, 472 вернікі | 1912 г.,<br>драўл. | Скачкоў Савер'ян<br>нар. – ; 25.IX.1906 г. | Лук'янаў Ф. |
| Рымутская, 1907 г.,<br>Гміна Опса, 702 вернікі | 1915, драўл. | Волкаў Іван<br>нар. 29.VIII.1878 г.; 21.IV.1925 г. | Рыбнікаў Т.<br>Памялаў А. |
| Гедзейская, 1910 г.,<br>Гміна Граўжышкі | 1885 г.,<br>драўл. | Зубкоў Іван<br>нар. 19.V.1872 г.; 8.IV.1923 г. | Сініцын А.<br>Каваленка Г. |
| Масцішская, 1864 г.,<br>Гальшанская гміна, 811 вернікаў | 1864 г., драўл. | Гуцянскі Андрэй<br>нар. 19.VIII.1877 г.; 6.I.1920 г. | Калеснікаў А.<br>Апочкін М. |
| Германавіцкая, 1926 г.,<br>Германавіцкая гміна, 1170 вернікаў | 1926 г.<br>(1900 г. [29, с. 56]),<br>драўл. | Аляксееў Іван<br>нар. – ; 18.II.1933 г. | Халява І.<br>Аляксееў І. |
| Ластовіцкая, 1865 г.,<br>Глыбоцкая гміна, 769 вернікаў | 1875 г.,<br>драўл. | Осіпаў Еўсцігней<br>нар. 1860 г.; 25.XII.1925 г. | Федараў І.<br>Естаф'еў М. |
| Залеская, 1865 г.,<br>Гміна Залессе, 530 вернікаў | 1926 г.,<br>драўл. | Сямёнаў Еўдакім<br>нар. 31.VII.1875 г.; 1.I.1921 г. | Савельеў П.<br>Сямёнаў К. |
| Ракаўская, 1911 г.,<br>Шаркаўшчынская гміна, 526 вернікаў | 1921 г.,<br>драўл. | Зуеў Авін<br>нар. 13.VIII.1876 г.; 27.XII.1931 г. | Самазванаў Д.<br>Фёдараў Ф. |
| Захараўская, 1876 г.,<br>Груздаўская гміна, 493 вернікі | 1876 г.,<br>драўл. | – | Артамонаў П.<br>Кузмін А. |
| Лучайская, 1826 г.,<br>Лучайская гміна, 612 вернікаў | 1914 г.,<br>драўл. | Дзямідаў Міна<br>нар. 1870 г.; 20.III.1918 г. | Лукашонак Ф.<br>Русалоўскі А. |

Аналізуючы вышэйвыкладзеныя статыстычныя звесткі, можна сцвярджаць, што агульная колькасць стараабраднікаў у Польшчы ў канцы 1930-х гадоў складала больш 50 тыс. чалавек. Ні дакументы ВСС, ні матэрыялы міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы не пацвярджаюць лічбу 80 тыс. стараабраднікаў [5, с. 149]. Пры гэтым можна пагадзіцца з думкай Е. Тамашэўскага аб тым, што ў міжваеннай Польшчы рускіх было адносна мала. Яны сапраўды не стваралі такой праблемы, як украінцы і беларусы, таму не было матываў для таго, каб прымяняць метады па змяншэнню іх колькасці [5, с. 47]. Як сведчаць прыведзеныя статыстычныя дадзеныя, не менш 38 % усіх стараабраднікаў прыходзілася на Браслаўскі павет. У польскай літаратуры месцамі кампактнага пасялення стараабраднікаў ў міжваеннай Польшчы называюцца рэгіёны гарадоў Вільні і Сувалак. Для большай дакладнасці да іх трэба абавязкова дадаваць Браслаў. З Браслаўшчыны паходзіць шэраг дзеячаў паморскай стараабрадніцкай царквы XX стагоддзя. Ураджэнец Відзаў С.Ф. Егупёнак быў духоўным настаўнікам Віленскай Свята-Пакроўскай царквы, членам прэзідыума ВСС у Польшчы ў перыяд паміж першай і другой сусветнымі войнамі, адным з лепшых знаўцаў гісторыі стараабрадніцтва. На Браслаўшчыне нарадзіліся іншыя вядомыя грамадскія дзеячы стараабрадніцтва – члены Духоўнага суда Вышэйшага стараабрадніцкага савета Літвы Яўфімій Кудрашоў, які быў настаўнікам Масцішскай абшчыны, настаўнік Пракопій Стралкоў, настаўнік Краслаўскай абшчыны ў Латвіі Іван Зуеў, настаўнік Відзаўскай абшчыны Міхаіл Бірулін [32, с. 659].

У красавіку 1936 года Дарафей Ранцаў прапанаваў Віленскаму ваяводскаму ўпраўленню ўласны праект статута стараабрадніцкай царквы, якая прызнавала іерархію (стараабраднікаў-папоўцаў) [33, л. 58 – 66]. Культавых пабудоў у іх не было. У Вільні налічваўся 31 чалавек, у Падбярэзскай абшчыне Віленска-Трокскага павета (в. Окмяна) – 46 чалавек, у вёсках Зусіна і Геладня – 18 [33, л. 67]. Прапанаваны статут не выклікаў сур'ёзнай зацікаўленасці ў вышэйшых царкоўных улад, разглядаўся ў якасці ініцыятывы прыватнай асобы. У час прыезду ў Вільню ў лютым 1938 годзе епіскапа Інакенція, кіраўніка стараабраднікаў-папоўцаў Румыніі і Польшчы, таксама рабіліся спробы па ўрэгуляванню іх становішча на Віленшчыне. Складзены ў сакавіку 1938 года чарговы праект статута быў адхілены міністэрствам веравызнанняў і грамадскай асветы Польшчы. Віленскі ваявода адмовіўся зарэгістраваць абшчыну стараабраднікаў-папоўцаў. Такую пазіцыю польскіх улад адносна стараабраднікаў-папоўцаў даследчыкі тлумачаць малазначнасцю гэтай групы ў этнарэлігійным жыцці [10, с. 196].

Парламенцкае прадстаўніцтва рускай меншасці ў Польшчы было даволі сціплым, не магло аказваць рашаючы ўплыў на ўрадавую нацыянальную палітыку Польшчы. Аднак Б. Піманаў, які быў выбраны паслом на парламенцкіх выбарах у 1930 і 1935 гадах, а таксама выстаўляў сваю кандыдатуру ў 1938 годзе, адстойваў не толькі асветніцкія, царкоўныя інтарэсы рускіх стараабраднікаў, але і іншых этнічных супольнасцей. Менавіта ён прадстаўляў польскаму сейму законапраект пра Мусульманскі рэлігійны саюз. У маі 1938 года пасол Б. Піманаў на чале дэлегацыі прадстаўнікоў рускай меншасці быў прыняты прэм'ер-міністрам Ф. Славой-Складкоўскім, якому была ўручана дакладная запіска аб патрэбах рускага насельніцтва. Шэраг патрабаванняў (найперш у галіне школьнай асветы) быў задаволены [34, с. 101]. 9 лютага 1937 года пры абмеркаванні плана інвестыцый на 1937/1938 гаспадарчы год пасол Б. Піманаў закранаў пытанне аб беспрацоўі і вымушанай сезоннай працы ў Латвіі насельніцтва Браслаўскага, Дзісенскага, Свянцянскага, Пастаўскага паветаў. 20 лютага 1937 года пры абмеркаванні бюджэта міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы Б. Піманаў таксама ўздымаў цэлы шэраг пытанняў – аб меншасцях і школьнай палітыцы, роднай мове дзяцей у школе, адукацыйных патрэбах рускай меншасці, рускіх школах у Польшчы [35, с. 6 – 8, 13 – 17].

У канцы 1930-х гадоў дзяржаўная падтрымка стараабраднікаў з боку Польскай дзяржавы аслабла. На працягу 1928 – 1938 гадоў стараабрадніцкая царква атрымала дзяржаўных датацый на суму 339877 злотых. Размеркаванне па асобных гадах выглядае наступным чынам (у злотых): 1928/1929 г. – 18000; 1929/1930 г. – 32000; 1930/1931 г. – 47900; 1931/1932 г. – 34700; 1932/1933 г. – 34700; 1933/1934 г. – 35900; 1934/1935 г. – 31677; 1935/1936 г. – 42000; 1936/1937 г. – 34000; 1937/1938 г. – 29000 [9, л. 135].

Не ўдалося ўтрымаць ранейшых пазіцый ў галіне асветніцкага жыцця. З 14 рускіх школ (2296 вучняў), якія дзейнічалі ў Польшчы ў 1923/1924 навучальным годзе; да 1937/1938 года засталася толькі адна стараабрадніцкая школа ў Вільні (292 вучні) [36, с. 124]. Пры гэтым трэба адзначыць, што ў спісе дзяржаўных польскіх школ, дзе выкладаўся ў 1937/1938 навучальным годзе Закон Божы для дзяцей стараабраднікаў, пазначаны 153 школы [22, л. 11 – 14].

У цэлым становішча стараабраднікаў у міжваеннай Польшчы нельга ацаніць адназначна. Як і іншыя прадстаўнікі рускай меншасці, яны паспыталі на сабе вынікі нацыянальнай палітыкі польскіх урадаў. Аднак стараабраднікі атрымалі юрыдычныя падставы для свайго этнакультурнага і канфесійнага жыцця. У параўнанні з праваслаўнай царквой, на якую праводзіўся наступ праз дэрусіфікацыю, паланізацыю царкоўных тэкстаў, мовы набажэнстваў, рэвіндыкацыю і закрыццё храмаў, стараабраднікі-беспапоўцы ўзамен на ідэйна-палітычную лаяльнасць атрымоўвалі падтрымку з боку Польскай дзяржавы. У такіх умовах ажыццяўляліся меры па захаванню традыцыйнай культуры, мовы, абрадаў стараабрадніцкага насельніцтва. Вышэйшы стараабрадніцкі савет у Польшчы шмат увагі надаваў культурна-асветніцкай пра-

цы – стварэнню школ, бібліятэк-чытальняў, маладзёжных рэлігійна-асветніцкіх гурткоў. Нягледзячы на колькасны рост вернікаў, у канцы 1930-х гадоў з-за паступовага згортвання грамадска-палітычнай актыўнасці рускай меншасці і іншых фактараў магчымасці для шырокага развіцця ў сферы духоўнага і канфесійнага жыцця стараабраднікаў былі абмежаванымі.

ЛІТАРАТУРА


1. Швайко, В.Г. Деятельность русских организаций в Польше по сохранению русской культуры в 1921 – 1939 годах: автореф. дис. … канд. ист. наук: 24.00.01 / В.Г. Швайко; УО «Гродн. гос. ун-т им. Я. Купалы». – Гродно, 2005. – 22 с.
2. Гарбацкі, А.А. Стараабраднiцтва на Беларусі ў канцы XVII – пачатку XX стст. / А.А. Гарбацкі. – Брэст: Выд-ва БрДУ, 1999. – 202 с.
3. Горбацкий, А.А. Старообрядчество на белорусских землях: моногр. / А.А. Горбацкий. – Брест: Изд-во УО «БрГУ им. А.С. Пушкина», 2004. – 237 с.
4. Добжинская, Т.В. Роль Высшего Старообрядческого Совета в Польше в довоенный период (1927 – 1929 гг.) / Т.В. Добжинская // Веснік Віцебск. дзярж. ун-та імя П.М. Машэрава. – 2004. – № 2 (32). – С. 38 – 41.
5. Tomaszewski, J. Ojczyzna nie tylko Polaków: Mniejszości narodowe w Polsce w latach 1918 – 1939 / J. Tomaszewski. – Warszawa: Młodieżowa Agencja Wydawnicza, 1985. – 224 s.
6. Zaleski, W.J. Międzynarodowa ochrona mniejszości / W.J. Zaleski. – Warszawa: IBSN, 1932. – 191 s.
7. Urbański, Z. Mniejszości narodowe w Polsce / Z. Urbański. – Warszawa: Wydawnictwo «Mniejszości narodowe», 1932. – 380 s.
8. Цэнтральны дзяржаўны архіў Літвы (Lietuvos Centrinis Valstybinis Archyvas) (ЦДАЛ). – Фонд. 1681. – Воп. 1. – Спр. 414.
9. Archiwum Akt Nowych (AAN). – Zespół 14. – Sygnatura 1270.
10. Krasowski, K. Związki wyznaniowe w II Rzeczypospolitej: Studium historycznoprawne / K. Krasowski. – Warszawa-Poznań: PWN, 1988. – 355 s.
11. Ogonowski, J. Uprawnienia językowe mniejszości narodowych w Rzeczypospolitej Polskiej 1918 – 1939 / J. Ogonowski. – Warszawa: Wydawnictwo sejmowe, 2000. – 286 s.
12. ЦДАЛ. – Фонд. 1681. – Воп. 1. – Спр. 60. – Л. 1 – 2.
13. AAN. – Zespół 9/1. – Sygnatura 1079. – S. 1 – 3, 7 – 19.
14. ЦДАЛ. – Фонд. 1681. – Воп. 1. – Спр. 124.
15. ЦДАЛ. – Фонд. 1681. – Воп. 1. – Спр. 61. – Л. 56.
16. ЦДАЛ. – Фонд. 1681. – Воп. 1. – Спр. 85. – Л. 24.
17. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Фонд. 114. – В. 1. – Спр. 2. – Л. 8 – 10.
18. Sprawy narodowościowe. – 1931. – № 4 – 5.
19. Sprawozdania z życia mniejszości narodowych. – Warszawa: Wydania MSW.– 1934. – 48 s.
20. ЦДАЛ. – Фонд. 1681. – Воп. 1. – Спр. 59. – Л. 189.
21. ЦДАЛ. – Фонд. 1681. – Воп. 1. – Спр. 420.
22. ЦДАЛ. – Фонд. 1681. – Воп. 1. –Спр. 435.
23. ЦДАЛ. – Фонд. 1681. – Воп. 1. – Спр. 27. – Л. 31.
24. ЦДАЛ. – Фонд. 1681. – Воп. 1. – Спр. 29. – Л. 94 – 94 адв.
25. ЦДАЛ. – Фонд. 1681. – Воп. 1. – Спр. 105. – Л. 166.
26. ЦДАЛ. – Фонд. 1681. – Воп. 1. – Спр. 468. – Л. 135.
27. ЦДАЛ. – Фонд. 1681. – Воп. 1. – Спр. 125.
28. ЦДАЛ. – Фонд. 1681. – Воп. 1. – Спр. 432. – Л. 31 – 32.
29. Кулагін, А.М. Праваслаўныя храмы на Беларусі: энцыкл. давед. / А.М. Кулагін. – Мінск: БелЭн, 2001. – 328 с.
30. Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна. – Фонд. 436. – Воп. 1. – Спр. 8. – Л. 13 адв. – 14.
31. Эберхард, П. Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі: 1897 – 1989 / П. Эберхард; пад. рэд. У. Люкевіча. – Брэст: Belfort, Беларускі Фонд Сораса, 1997. – 282 с.
32. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Браслаўскага раёна. – Мінск: Паліграфафармленне, 1998. – 709 с.
33. AAN. – Zespół 14. – Sygnatura 1272.
34. Михайлов, В.С. Видзы и Видзовщина. Очерки и документы: история, культура, жизнестроение, цивилизация, экономика / В.С. Михайлов. – Вильнюс: Древлеправославие. Слово и книга; UAB «Respublikos blankai», 2000. – 162 с.
35. Речи депутата Б.А. Пимонова, произнесённыя в польском сейме в 1937 – 1938 гг. Изложено по газетным отчётам и официальным стенограммам. – Вильно: Б. и., 1938. – 22 с.
36. Mauersberg, S. Szkolnictwo powszechne dla mniejszości narodowych w Polsce w latach 1918 – 1939 / S. Mauersberg. – Wrocław: Ossolineum, 1968. – 230 s.


*Паступіў 18.06.2007*